# I.2.1.2.
# Бронзавы век

У пачатку 2-га тысячагоддзя да н.э. жыхары Беларусі пазнаёміліся з першымі металічнымі рэчамі – спачатку меднымі, а пасля і бронзавымі (бронза – гэта сплаў на аснове, які пераўзыходзіць па сваіх якасцях і трываласці чыстую медзь).

Аднак цэнтры старажытнай металургіі знаходзіліся далёка ад тэрыторыі нашай краіны – у Сярэдняй Азіі, Закаўказзі, на Блізкім Усходзе, таму бронзавых і медных вырабаў было мала і яны былі надзвычай каштоўнымі. Гэта былі пераважна ўпрыгажэнні і зброя.



Бронзавая сякера. Кальвішкі Браслаўскага р-на. Заходняя Віцебшчына



Выплавка бронзы. Начало «бронзового века» II тыс. до н. э. (Европа)

Пераважная большасць прылад працы і зброі па-ранейшаму выраблялася з крэмню. У бронзавым веку шырока распаўсюдзілася шліфаванне каменю і свідраванне ў вырабах адтулін для рукаятак – быў вынайдзены свідравальны станок, які стаў другім пасля лука механічным прыстасаваннем



Станок для свідравання каменя. Рэканструкцыя



Землеробства і жывёлагадоўля з дапаможных заняткаў паступова ператварыліся ў асноўныя. Больш распаўсюджанымі сталі прадзенне і ткацтва. Поспехі ў эканамічным развіцці прывялі да ***зараджэння сацыяльнай і маёмаснай няроўнасці***.

Багатыя пахаванні мужчын-ваяроў з вялікай колькасцю медных і бронзавых рэчаў сведчаць пра зараджэнне родаплемяннай арыстакратыі. Назапашванне пэўных багаццяў, імкненне авалодаць самымі ўрадлівымі землямі або крамянёвымі радовішчамі вялі да пашырэння міжплемянных узброеных сутычак.



Нераўнамернасць развіцця розных рэгіёнаў, попыт на карысныя выкапні, якія таксама залягаюць вельмі нераўнамерна, спрыялі развіццю абмена.

З Беларусі ў Прыбалтыку ішоў крэмень, у адваротным кірунку – бурштын.



З сярэдзіны 2-га тыс. да н.э. пад уплывам земляробча-жывёлагадоўчых культаў, звязаных з абагаўленнем сонца і агню як жыватворных сіл, распаўсюджваецца звычай спальвання нябожчыкаў.



Асноўныя тыпы глінянага посуду, якім карысталася насельніцтва бронзавага веку Беларусі




Курганнае пахаванне сярэднедняпроўскай культуры (план і профіль), якое мела пад курганным насыпам тры пахаванні і чацвёртае падзахаванне ў прыкурганным раўчуку. Могільнік каля в. Ходасавічы

У бронзавым веку па ўсёй тэрыторыі Беларусі рассяліліся ваяўнічыя
плямёны, вядомы пад агульнай назвай ***індаеўрапейцаў***. Характэрнымі
адзнакамі гэтых плямёнаў былі баявыя лодкападобныя сякеры і
шнуравая арнаментацыя керамікі.

Мясцовае насельніцтва пачало паступова змешвацца з імі,
ус ай і





Індаеўрапеец з Сярэдняга Падняпроўя. Паводле матэрыялаў з пахавання 5-га тысячагоддзя да н. э.

Індаеўрапейцы рассяліліся на Балканскім паўвостраве, у Малой Азіі, у заходнім і паўночна-заходнім Прычарнамор’і яшчэ ў глыбокай старажытнасці.



На рубяжы 3 і 2 тыс. да н.э. у сувязі з развіццём жывёлагадоўлі (пастаянным павелічэннем пагалоўя жывёлы, для якой патрабаваліся новыя выпасы), ростам насельніцтва, а магчыма, нават дэмаграфічным выбухам, яны пачалі рассяляцца па тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ад Рэйна на захадзе да сярэдняй Волгі на ўсходзе і ад Швецыі і Фінляндыі на поўначы да цэнтральнай Украіны на поўдні.

Гэтае перасяленне паклала пачатак утварэнню многіх старажытных еўрапейскіх і азіяцкіх этнасаў: ***галаў, грэкаў, кел***



# ЯКІЯ ЁСЦЬ ПЫТАННІ?